# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ СЛОЎ СА ЗНАЧЭННЕМ КОЛЕРУ Ў ПАЭМАХ ЯКУБА КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ» І «СЫМОН-МУЗЫКА»

**Валкалоўская Яўгенія Ігараўна, Беларусь**

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт*

*Беларусь, Мінск*

*Навуковы кіраўнік – канд.філал.навук дацэнт,*

*загадчык кафедры беларускай філалогіі Русак В.У.*

Мэта працы заключаецца ў выяўленні ўніверсальных характарыстык і нацыянальна-культурнай спецыфікі каларатыўных эпітэтаў у паэтычным кантэксце Якуба Коласа. У рабоце выяўлены значэнні, з якімі ўжываюцца колеравыя і светлавыя эпітэты ў паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка», паказана, якія з гэтых значэнняў з'яўляюцца сталымі, традыцыйнымі для ўспрыняцця беларуса, а якія выступаюць у якасці адметнай рысы ідыястылю Коласа.

*Ключавыя словы: эпітэт, колер, колераабазначэнне, колеравая палітра, каларонімы.*

# FEATURES OF USE OF COLOR VALUE WORDS IN THE POEMS OF YAKUB KOLAS «NEW LAND» AND «SIMON THE MUSICIAN»

**ValkalovskayaYauheniya, Belarus**

*Belarusian State Technological University*

*Belarus, Minsk*

*Scientific supervisor – PhD, assistant professor,*

*head of the department of belarusian philology Rusak V.U.*

The aim of the work is to reveal universal characteristics, national and cultural specifics of color epithets in a poetic context of Yakub Kolas. In the work the values are revealed with which color and light epithets are applied in poems “New Land” and “Simon the Musician”, indicated, which of these values are permanent, traditional for the perception of Belarusians, and which of them are the distinguishing feature of Kolas idiostyle.

*Keywords: the epithet, color, color terms, color palette, coloronims.*

Для намінацыі лексікі са значэннем колеру ў літаратуры ўжываюцца розныя тэрміны: *колераабазначэнне*, *колеравыя словы*, *каларатывы*, *каларонімы*. Тэрмінам *каларонім* абазначаюць усе словы з колеравым значэннем (*белы*, *чырвоны*, *сіне-зялёны*, *чарнаваты*, *жоўценькі*, *сінець* і г.д.).

Феномен колеру шматгранны, таму працэсы колераўспрыняцця, а таксама колераабазначэння ў мове не адно дзесяцігоддзе працягваюць цікавіць даследчыкаў. Вучонымі заўважана, што ўспрыняцце колеру грунтуецца на шматлікіх лінгвакультурных і індывідуальных характарыстыках, а таму з'яўляецца своеасаблівым у прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, культур, менталітэтаў, характараў.

Адметную функцыю выконвае колеравая лексіка ў творах мастацкай літаратуры, асабліва ў паэтычных тэкстах. У паэзіі творца, малюючы словам, не можа пакінуць без увагі выяўленчыя магчымасці колеру.

У якасці аб'екта даследавання намі былі абраны паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка»Якуба Коласа, якія стаяць побач з найлепшымі творамі сусветнай літаратуры. Багатая і разнастайная спадчына Якуба Коласа – арганічная частка духоўнай культуры беларусаў.

Напісаныя прыкладна ў адзін час, паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка» настолькі непадобныя па характары паэтычнага светабачання, творчай

Репозиторий БГМУ

манеры мастака, фармальных прыкметах, што вытлумачыць гэта адрозненне можна толькі шматграннасцю асобы паэта і геніяльнасцю яго мастакоўскага дару.

«Сымон-музыка» па характары паэтычнага светабачання выразна рамантычны твор, але у ім прысутнічае моцная ідэя разладу з рэчаіснасцю. У паэме «Сымон-музыка» перавага аддаецца цёмным колерам – чорнаму, шэраму і сіняму. Гэта колеры смутку і холаду, трывогі, што надае больш трагічны, песімістычны настрой паэме «Сымон-музыка».

Чорны колер – гэта традыцыйны колер бяды, гора, цяжару. Чорны колер, паводле М. Люшэра, перадае ідэю небыцця, знікнення. Часты выбар чорнага сведчыць, паводле дадзеных псіхолагаў, пра наяўнасць канфлікту, перашкод, незадаволенасць нечым:

*І чарнее неба сінь,*
*Нікне сонца ў чорным муту.*

Сіні колер мае сімвалічнае значэнне смутку, холаду і разам з тым спакою. Па тэорыі Гётэ, гэта асноўны з пасіўных па эмацыянальным уздзеянні колераў, які выклікае пяшчотнае, але неспакойнае і тужлівае пачуццё. Ён «не наступае, а адыходзіць». Сіняе асацыіруецца з цемрай, ценем [2, с.44].

Шэры колер, паводле тэста М. Люшэра, гэты колер нейтральны, ён не мае стымулюючых тэндэнцый, гэта нібы раздзел паміж «кантрастуючымі зонамі» [3, с.61].

Для больш аптымістычнай па тоне »Новай зямлі» тыповы код «белае – чырвонае». У паэме бясспрэчную перавагу Якуб Колас аддае ахраматычнаму беламу колеру. Эпітэт *белы* ўжываецца ў розных кантэкстах, а таму яго можна назваць полісемантычным. Так, у спалучэнні з такімі словамі, як *абрус* (*Абрусам белым стол засланы)*, *настольнік* (*І стол той гуртам прыбіраюць, Настольнік белы падымаюць*), *павязка* (*З павязкай белай, даматканай*), *кофта* (*Жней чародкі Ідуць паважна, як лябёдкі, У хустках лёгкіх, кофты белы*) адлюстроўваюцца адметнасці быту беларусаў.

У лік колераў, якія спрадвеку былі асноўнымі для славян, уваходзіць чырвоны. Славяне лічылі белыя і чырвоныя фарбы святымі і выкарыстоўвалі іх у адзенні, дэкаратыўным мастацтве, дойлідстве.

Пры параўнанні колераабазначэння ў паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка» можна вызначыць шэраг цікавых заканамернасцяў.

Паэма «Новая зямля» – твор рэалістычны па характары паэтычнага светабачання, «Сымон-музыка» – выразна рамантычны. Таму заканамерна, што ў «Новай зямлі» больш «рэальных» колераў, а ў паэме «Сымон-музыка» значна больш слоў са значэннем «золата», «срэбра», «бляск», «агонь», а таксама люксонімаў «ясны», «светлы» («Сымон-музыка» – адпаведна – 39% слоў ад колькасьці ўсіх каларонімаў, «Новая зямля» – 17% слоў). Такія рамантычныя, умоўныя колераабазначэнні ствараюць таямнічы, загадкавы, магічны каларыт паэмы «Сымон-музыка»:

*І быў сэрцам ён чуллівы.*
*Срэбраструнны, златагукі,*
*Залатыя сонца далі*



Репозиторий БГМУ

*На яго адбітак клалі*
*Чары дзіўнага спявання.*

Зялёны, белы, чырвоны колеры называюцца ў паэме «Сымон-музыка» значна радзей, чым у «Новай зямлі» (3%, 11%, 5% ад агульнай колькасці – у«Сымон-музыка»; 5%, 24%, 13% – у«Новай зямлі»).

Рамантычная колеравая палітра паэмы «Сымон-музыка» – з блікаў, ззяння, няясных адценняў колеру; рэалістычныя колеры «Новая зямлі» – чыстыя, «бытавыя», моцныя.

Выбар паэтам-мастаком прыярытэтных колераў – надзвычай складаны творчы акт. Параўнанне колераабазначэння ў «Новай зямлі» і ў паэме «Сымон-музыка» даюць магчымасць зрабіць некаторыя вывады аб спецыфіцы рэалістычнага і рамантычнага светаўспрымання, аб унутраным духоўным стане аўтара і ідэйна-мастацкай гармоніі коласаўскіх паэм.

Літаратура

1. Бабіч, Ю.М. Колеравая і светлавая эстэтыка ў мове твораў Якуба Коласа: Манаграфія / Ю.М. Бабіч. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2002. – 127 с.

2. Гёте, И. В. Об искусстве / И. В. Гёте. – М., 1975. – 623 с.

3. Luscher, M. TheLuscher Color Test/M.Luscher– London, 1970.

4. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы, 2009 – Т. 8: Паэма «Новая зямля» – С. 344.

Репозиторий БГПУ